**Водзыў**

аб аўтарэфераце дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Дысертацыйнае даследаванне, якое прадстаўлена ў аўтарэфераце, з'яўляецца дастаткова актуальным у галіне нацыянальнай педагагічнай навукі, бо па свайму зместу і сутнасці мае гісторыка-педагагічны характар. Такі характар даследавання абумоўлівае рэтраспектыўны аналіз тэндэнцый развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы разам з вызначэннем яе перспектыў. Нягледзячы на назву дысертацыйнага даследавання «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» яно мае не монадысцыплінарны, а міждысцыплінарны характар. Аб гэтым сведчыць комплекснае вызначэнне саіскальнікам канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы на I, II, III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі і як сацыягуманітарнай з'явы. Сведчаннем міждысцыплінарнасці з'яўляецца таксама ўлік саіскальнікам метадалагічных асаблівасцей гісторыі адукацыі як галіны педагагічнай навукі ў спалучэнні з метадалагічнымі прынцыпамі гістарычнага пазнання як галіны гістарычнай навукі.

Саіскальнікам канкрэтызаваны структурныя кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы: канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, змястава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны. Такая канкрэтызацыя зроблена ў спалучэнні з адпаведнымі фактарамі, якія дэтэрміміравалі развіццё школьнай гістарычнай адукацыі. Сярод такіх фактараў, адлюстраваных графічна ў сканструяванай саіскальнікам мадэлі вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, вызначаны, напрыклад, дзяржаўная гістарычная палітыка, накіраваная на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага. Сведчаннем прыхільнасці саіскальніка культуралагічнай канцэпцыі зместу адукацыі з'яўляецца вызначэнне ў якасці фактару развіцця школьнай гістарычнай адукацыі яе зместу як сацыяльнага вопыту, што трансліруецца ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі пры забеспячэнні пераемнасці гістарычнай памяці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства.

У заяўленым і рэалізаваным саіскальнікам інстытуцыянальна-ведамасным аспекце школьнай гістарычнай адукацыі актуалізуецца яе светапоглядна-выхаваўчая функцыя, што адпавядае мэтам і зместу Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг. У згаданым аспекце асаблівую актуальнасць набывае ахарактарызаваная ў аўтарэфераце змястава і структурна сацыяльна-педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі (на жаль без яе графічнага

адлюстравання), што распрацавана з удзелам саіскальніка ў межах навукова-даследчай работы у Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы. Гэтыя абставіны адзначаны ў аўтарэферацe пры характарыстыцы сувязі даследавання з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі, дзе, акрамя вышэйзгаданай тэмы прыводзяцца звесткі аб яшчэ 12 навукова-даследчых тэмах з удзелам саіскальніка.

Навуковую навізну даследаванню надае вывучэнне школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы, што прадстаўлена праз канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства, якія тэарэтычна вызначаны прадстаўнікамі сучаснага беларускага навукова-педагагічнага супольніцтва і рэалізаваны ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі. Варта адзначыць, што пералічаныя вышэй канцэпты практычна выкарыстаны саіскальнікам для правядзення кантэнт-аналізу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі з улікам яе дзяржавастваральнага патэнцыялу.

Варта адзначыць, што канцэпт грамадска-культурнай ідэнтычнасці вучняў пазіцыяніруецца саіскальнікам як сацыяльна-педагагічная катэгорыя ў складзе канкрэтнай эмацыянальна-псіхалагічнай, палітыка-ідэалагічнай, культураадпаведнай пазіцыі асобы і ў якасці адной з перспектыў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі. Пры гэтым саіскальнікам прымаецца да ўвагі меркаванне сучасных педагогаў-даследчыкаў у канцэпцыі фарміравання маральных якасцей вучняў пра тое, то менавіта эмацыянальна-пачуццёвы кампанент асобы з'яўляецца вызначальным. Цікавымі ўяўляюцца ў вышэйзгаданым аспекце вынікі анкетавання саіскальнікам эмацыянальна-каштоўнасных адносін настаўнікаў гісторыі да прадстаўнікоў беларускай нацыі, прадстаўленых у змесце школьнай гістарычнай адукацыі ў IX класе пры вывучэнні гісторыі Беларусі 1917 г. – пачатку XXI ст. Пры гэтым саіскльнікам заўважаецца захаванне настаўнікамі савецкага тыпу беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці як часткі сацыяльнага вопыту грамадзян сучаснай беларускай дзяржавы.

Практычная значнасць даследавання падцвярджаецца інфармацыяй аб выкарыстанні яго вынікаў у інстытутах развіцця адукацыі на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў гісторыі, удзелам С. В. Панова ў стварэнні 19 вучэбных дапаможнікаў па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі для розных класаў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў распрацоўцы Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, адобранай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2022 г.

Як сведчыць аналіз зместу дысертацыйнага даследавання С. В. Панова, прадстаўлены ў аўтарэферацe, саіскальнікам упершыню ў тэорыі і практыцы школьнай гістарычнай адукацыі комплексна выяўлены яе тэндэнцыі і перспектывы развіцця як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і сацыягуманітарнай з'явы. Яны тычацца змен у канцэптуальным мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення зместу, цыклічнасці ў яго

дыдактычным структураванні, удакладненне функцыяналу, а таксама ажыццяўлення нацыястваральнай ролі гісторыяй Беларусі, удакладненне прынцыпаў адбору зместу, інтэграцыі гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Уяўляецца магчымым на падставе вывучэння зместу аўтарэферата зрабіць выснову аб дасягненні саіскальнам мэты дысертацыйнага даследавання, якая прадугледжвае вызначэнне і абгрунтаванне канцэптуальных асноў развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы, што актуальна для мадэрнізацыі яе структуры, зместу, функцыяналу.

Аўтарэферат дысертацыйнага даследвання С. В. Панова па сваім афармленні адпавядае патрабаванням «Інструкцыі аб парадку афармлення кваліфікацыйнай навуковай работы (дысертацыі) на атрыманне вучоных ступеняў кандыдата і доктара навук, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі» у рэдакцыі пастановы Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5.

Змест аўтарэферата дысертацыі С. В. Панова «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» сведчыць аб тым, што аўтарскае гісторыка-педагагічнае даследаванне адпавядае навуковай кваліфікацыі доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Водзыў заслушаны і абмеркаваны на пасяджэнні кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» (пратакол № 8 ад 20 лютага 2025 г.

Эксперт, прафесар кафедры педагогікі,
доктар педагагічных навук, прафесар Ф.У. Кадол

Загадчык кафедры педагогікі,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт А.Я. Кошман

Подпіс Кадол, Кошман
сведчу начальнік
ЗАВЯРАЮ
Начальнік аддзела кадраў установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»
Алехновіч

АДДЗЕЛ КАДРАЎ